# СІСТЭМА АХОВЫ ПРАВАПАРАДКУ БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ГУБЕРНЯЎ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

***А. Э. Сакольчык***

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі, вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь, edwardowna@mail. ru*

Дадзены матэрыял прадстаўляе сабой гістарыяграфічны агляд наяўнай тэматычнай літаратуры, дзе акрэсліваецца спецыфіка характару публікацый па праблеме ў розныя гістарычныя перыяды: дарэвалюцыйны, савецкі, сучасны. Прааналізавана ступень распрацаванасці вылучанай навуковай праблемы, вызначаны канцэптуальныя і метадалагічныя падыходы да яе асвятлення, звернута ўвага на перспектыўныя накірункі далейшага даследавання тэмы.

***Ключавыя словы:*** праваахоўныя органы; правапарадак; агульная паліцыя; палітычная паліцыя; паліцэістыка; юрыдычная навука; гістарыяграфія.

# СИСТЕМА ОХРАНЫ ПРАВОПОРЯДКА БЕЛОРУССКО-ЛИТОВСКИХ ГУБЕРНИЙ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XIX – НАЧАЛА XX В.: ИСТОРИОГРАФИЯ ПРОБЛЕМЫ

***Е. Э. Сокольчик***

*Институт истории НАН Беларуси, ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь, edwardowna@mail. ru*

Данный материал представляет собой историографический обзор существующей тематической литературы, в котором излагается специфика характера публикаций по проблеме в разные исторические периоды: дореволюционный, советский, современный. Проанализирована степень разработанности выбранной научной проблемы, определены концептуальные и методологические подходы к ее освещению, уделено внимание перспективным направлениям дальнейшего исследования темы.

***Ключевые слова:*** правоохранительные органы; правопорядок; общая полиция; политическая полиция; полицеистика; юридическая наука; историография.

# THE SYSTEM OF LAW ENFORCEMENT IN THE BELARUSIAN-LITHUANIAN PROVINCES OF THE SECOND HALF OF THE XIX - EARLY XX CENTURIES: HISTORIOGRAPHY OF THE PROBLEM

***A. Sakolchyk***

*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Akademicheskaya str., 1, 220072, Minsk, Belarus, edwardowna@mail. ru*

This material is a historiographical review of the existing thematic literature, which outlines the specifics of the nature of publications on the problem in different historical periods: pre-revolutionary, Soviet, modern. The degree of elaboration of the chosen scientific

problem is analyzed, conceptual and methodological approaches to its coverage are defined, attention is paid to promising areas of further research of the topic.

***Key words:*** law enforcement agencies; law and order; general police; political police; policeistics; legal science; historiography.

Тэма сістэмы аховы правапарадку з’яўляецца не новай для гуманітарнай навуковай думкі. Спецыфіка характару праблемы, якая знаходзіцца на стыку паліцэйска-прававой тэорыі і гістарычных ведаў, прывяла да назапашвання багатай тэматычнай літаратуры. Упершыню на інстытут паліцэйскай службы звярнулі ўвагу дарэвалюцыйныя даследчыкі. Гэта былі прававеды, гісторыкі права, спецыялісты па гісторыі дзяржаўных устаноў (дзяржавазнаўцы) і супрацоўнікі органаў унутраных спраў [3; 18; 35; 42]. Асноўны масіў прац створаны ў русле паліцэйскага права і тэарэтычнага напрамку паліцэістыкі. Ён прадстаўляў сабой корпус лекцыйнага матэрыялу, юрыдычна-гістарычных аглядаў, ведамасных перыядычных выданняў МУС і дазваляе прасачыць асноўныя этапы развіцця паліцэйскіх інстытутаў, нарматыўна-прававую базу іх дзейнасці, законатворчы бок перыяду рэфармавання органаў праваахоўнай сістэмы, функцыі і абавязкі адпаведных устаноў. Хаця ў аналітычным плане большасць аўтарскіх ацэнак зроблена з пункту гледжання фармальна-юрыдычнага чым канкрэтна-гістарычнага. Безумоўна, аўтарам неабходна было прадэманстраваць афіцыйны погляд ураду на сутнасць рэарганізацыі паліцыі з мэтай фарміравання грамадскай думкі аб правільнасці рэфарматарскага накірунку. Каштоўнасць дадзеных прац заключаецца ў старанным камплектаванні і аналізе нарматыўна-прававога матэрыялу і суправаджальна-даведачнага апарату да яго. Яшчэ адной яскравай рысай дарэвалюцыйная гістарыяграфіі выступае рэтраспектыўны агляд паліцэйскіх устаноў Расійскай імперыі ў межах вялікіх храналагічных перыядаў (1775–1872, 1703–1903, 1802–1902). Лагічнае тлумачэнне такога метадалагічнага падыходу вынікае з жыццёвай неабходнасці пры стварэнні новых законапраектаў абапірацца на ўсебакова вывучаны вопыт мінулага. А ў сучасным разуменні дапамагае скласці паэтапнае агульнае ўяўленне пра эвалюцыю, якую прарабілі дзяржаўныя паліцэйскія структуры. Прывабнасць дарэвалюцыйных выданняў таксама ў тым, што аўтары, будучы сведкамі і непасрэднымі ўдзельнікамі падзей, палітрай сваіх разважанняў (ліберальных, радыкальных, афіцыйных) ствараюць свайго роду фактлагічную базу для больш глыбокага і ўзвешанага аналізу

ўнутраных працэсаў сістэмы аховы правапарадку другой паловы XIX – пачатку XX ст. сённяшнімі навукоўцамі і даследчыкамі.

З вышэйназванага кантэксту вылучаюцца працы, прысвечаныя прававой культуры насельніцтва Расійскай імперыі (пераважна сялянскага) [10; 26]. Яны не так часта выкарыстоўваюцца сучаснымі даследчыкамі пры кампаратыўным аналізе сістэмы аховы правапарадку, але дазваляюць лепш зразумець як спецыфіку ўспрыняцця і стаўленне насельніцтва да праваахоўных органаў, так і ў цэлым узровень і характэрныя рысы прававой свядомасці суб’ектаў і аб’ектаў разгляданай сістэмы.

У савецкі час паліцэйская праблематыка не ўваходзіла ў кола запатрабаваных і актуальных даследчыцкіх напрамкаў, бо іх авангард складала сацыяльна-эканамічная тэматыка. Да яе часткова або ўскосна звярталіся навукоўцы, што займаліся пытаннямі барацьбы царызму з рэвалюцыйнымі рухамі [1; 2; 14; 17]. Як правіла, канцэптуальнай паліфаніі не адчувалася, а гучала адзінагалоссе, якое паказвала рэакцыйны характар паліцыі як карна-ахоўнага інстытута самадзяржаўнай Расійскай імперыі. Рэдка, але з’яўляліся працы непасрэдна па гісторыі палітычнага розшуку і тэматычная мемуарыстыка [12; 22]. У пасляваенны час цікавасць да праблемы значна пашырылася. З’явіліся працы, прысвечаныя інстытуцыянальнаму аспекту дзейнасці паліцэйскіх органаў, іх месцу ў сістэме дзяржаўнага апарату і механізме дзяржаўнага кіравання, структурным змяненням, вядучым праваахоўным функцыям і абавязкам [20; 37; 41; 51; 53]. Частка тагачасных выданняў была падрыхтавана ў Вышэйшых школах МУС. Таму іх канспектыўны характар выкладання факталагічнага матэрыялу і ступень яго абагульнення быў абмежаваны вучэбнымі мэтамі і прызначэннем для студэнцкай аўдыторыі.

Заўважаючы негатыўныя бакі савецкай эпохі (ідэалагічную заангажаванасць, прыярытэты праблемнага поля) і адпаведны ўплыў на эвалюцыю тэматычнай гістарыяграфіі, нельга не адзначыць, што ступень аб’ектыўнасці высноў вар’іравалася ў рамках існуючай парадыгмы ад поўнага непрыняцця і негатыўнага ўспрымання паліцыі да разумення яе як важнага органа забеспячэння правапарадку ўнутры краіны.

У навейшай расійскай гістарыяграфіі назіраецца ўстойлівая зацікаўленнасць пытаннямі сістэмы аховы правапарадку. Адказваючы на выклікі часу, яна папоўнілася каласальнай колькасцю абагульняючых прац

[8; 44; 47], зборнікаў дакументаў [40; 43], абароненных дысертацый. Імпульс такой актуалізацыі праблемы, яе сацыяльнай і практычнай значнасці быў пакладзены рэформамі паліцэйскай службы Расійскай Федэрацыі ў 2000-х гг. Аўтары дысертацыйных даследаванняў пашырылі тэматычны ландшафт. Яны звярнуліся да аспектаў, якія раней вывучаліся фрагментрана і не вылучаліся як самастойныя праблемы: прававое і сацыяльнае забеспячэнне дзейнасці паліцыі, прафесійная падрыхтоўка кадраў, яе фінансаванне і рэгіянальныя асаблівасці ў функцыянаванні паліцэйскай службы [6; 15; 19; 24; 45]. Па падліках А. А. Кісялёва, за перыяд з 1992 г. па 2017 г. у навуковых і адукацыйных установах Расійскай Федэрацыі было абаронена 167 дысертацый, прысвечаных розным аспектам паліцэйскай арганізацыі Расійскай імперыі. З ліку выяўленых навукоўцам дысертацыйных даследаванняў 76 (45,5 % ад усіх прааналізаваных) сваім прадметам навуковых розшукаў выбрала паліцэйскія структуры расійскай правінцыі. З іх трэцяя частка прысвечана выключна палітычнай паліцыі МУС. Каля паловы астатніх прац (34 аўтарэфераты – 44,7 %) закранаюць стан агульнай паліцыі. У геаграфічным плане А. А. Кісялёў убачыў своеасаблівы рэкорд сярод даследуемых абласцей. Ён належыць адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам Сібіры. Беларуска-літоўскія і ўкраінскія землі не знайшлі свайго даследчыка сярод расійскіх навукоўцаў. Аўтар аналізу такую абумоўленасць тлумачыць тым, што дадзеныя рэгёны не разглядаюцца ў рамках спецыяльнасці «Айчынная гісторыя» і таму застаюцца ў поле зроку «нацыянальных гістарыяграфій сённяшніх дзяржаў» [30].

Яскрава бачыцца метадалагічны пераход у тэматычнай гістарыяграфіі ад гісторыі інстытуцый да разгляду некаторых аспектаў праз прызму сацыяльнай гісторыі і псіхагісторыі [5; 36]. Папулярнае ў пяпярэднія перыяды праблемнае поле таксама не засталося па-за ўвагай навукоўцаў (рэформы і заканадаўства аб паліцыі, яе функцыі, палітычны розшук і нагляд і г. д.) [4; 49]. Зразумела, яно напоўнілася новым факталагічным, архіўным матэрыялам і канцэптуальнымі падыходамі. Багаты існуючы літаратурны матэрыял па праблеме не застаўся без даследчыцкага аналізу і асэнсавання назапашанага навуковага вопыту, таму ў апошнія гады актуалізаваліся публікацыі гістарыяграфічнага і крыніцазнаўчага характару [30; 39; 48].

Сучасная беларуская гістарыяграфія не мае такой трывалай інтэнсіўнасці ў вывучэнні гісторыі сістэмы аховы правапарадку. Некаторымі даследчыкамі праведзены глыбокія дысертацыйныя даследаванні, але большасць публікацый прадстаўлена асобнымі навуковымі артыкуламі [21;25;32;46]. Пальма першынства ў навуковых інтарэсах належыць гісторыі палітычнай паліцыі і жандармерыі [9; 13; 16; 34; 38]. Паколькі праблема праваахоўнай сістэмы цесна перакрыжавана з пытаннямі сацыяльна-небяспечных з'яў і злачыннасці, дзейнасцю службы чыноўніцтва, судовай, турэмнай і пажарнай сістэмы, то даследчыкі, якія іх разглядаюць, у той ці іншай ступені звяртаюцца да гісторыі паліцыі адпаведнага перыяду [11; 33; 50; 52].

Даведачная і вучэбная літаратура, канешне ў меру свайго прызначэння, абмяжоўваецца кароткімі аглядамі і зводзіцца да фрагментарнай характарыстыкі, простай канстатацыі фактаў у арганізацыі праваахоўных органаў і іх практычнай дзейнасці [23].

Найбольш шчыльна пытанні, звязаныя з функцыянаваннем паліцыі на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў у другой палове XIX – пачатку XX ст., вувучаюцца беларускім гісторыкам А. А. Кісялёвым. Навукоўцам на сённяшні дзень прааналізаваны рэфарматарскія праекты рэалізаваных і нерэалізаваных мерапрыемстваў на мясцовым узроўні, структурныя элементы павятовай і гарадской паліцыі па асобных губернях і іх змяненні, спецыфіка кадравай палітыкі і ўплыў на яе паўстання 1863–1864 гг. [27; 28; 29; 30; 31]. Высновы гісторыка грунтоўныя, падмацаваныя шырокай дакументальнай базай з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, Расійскага і Літоўскага гістарычных архіваў. Аднак застаецца яшчэ шэраг тэматычных лакун, без якіх немагчыма цэласнае ўяўленне аб сістэме аховы правапарадку. Напрыклад, субардынацыя і ўнутраная камунікацыя паліцэйскіх служачых, іх зносіны з іншымі органамі ўлады, насельніцтвам, кампетэнцыі, практычная дзейнасць і г. д.

Што датычна замежнай гістарыяграфіі (англамоўнай), то фокус увагі даследчыкаў сканцэнтраваны ў асноўным на рэформах Расійскай імперыі, адпаведна і паліцэйскай. Усе новатворчыя працэсы разглядаюцца аўтарамі ў агульнаімперскім маштабе праз прызму тэорыі мадэрнізацыі [7].

Такім чынам, адзначаны навуковы арсенал паказвае, што тэма прадаўжае чакаць сваіх даследчыкаў як па асобных аспектах, так і ў абагульняючым плане.

**Бібліяграфічны спіс**


1. 1905: история революционного движения в отдельных очерках: [в 3 т.]. М.; Л.: Гос. изд-во, 1925–1927. Т. 3.
2. Агурский С. Х. Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863–1917). Минск: Белгосиздат, 1928.
3. Анучин Е. Н. Исторический обзор развития административно-полицейских учреждений в России с учреждения о губерних 1775 г. до последнего времени: репринт. изд. М.: URSS Ленан, 2016.
4. Байкова Н. Ф. Формирование и развитие полицейских функций государства в России в XIX начале XX в.: автореф. дис. ... канд. юрид. наук. Саратов, 2009.
5. Безгин В. Б. Правовые обычаи и правосудие русских крестьян второй половины XIX – начала XX века. Сайт РГНФ. URL: http://www. rfh. ru/downloads/Books/124193008. pdf
6. Бойкеева С. Е. Кадровое обеспечение полицейских органов в Российской империи (историко-правовой аспект): автореф. дис. ... канд. юрид. наук. СПб., 2001.
7. Большакова О. В. Бюрократия, реформы и контрреформы в России (1855–1894) в освещении англоязычной историографии: автореф. дис. … канд. ист. наук. М., 2001.
8. Борисов А. В. Три века Российской полиции. М.: Рипол классик, 2017.
9. Бресская Ю. С. Становление органов политической полиции на территории Беларуси в начале XX века // Гісторыя і грамадазнаўства. 2014. № 11. С. 62–64.
10. Бржеский Н. К. Очерки юридического быта крестьян. СПб.: тип. В. Киршбаума, 1902.
11. Бригадин Д. П. Преступность в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. Минск: Государственный институт управления и социальных технологий БГУ, 2018.
12. Бурцев В. Л. За кулисами охранного отделения: с дневником провокатора, письмами охранников, тайными инструкциями / составил А. Б. Berlin: Henrich Caspari, 1910.
13. Бусько С. І. Палітычная паліцыя ў беларускіх губернях: стварэнне, структура, дзейнасць (1898 – сакавік 1917 гг.): дыс …. канд. гіст. навук. Мінск, 2011.
14. Вержбицкий В. Г. Революционное движение в русской армии: (с 1826 по 1859 гг.). М.: Советская Россия, 1964.
15. Горлова Н. И. Полиция российской провинции в XIX веке: на примере Курской губернии: автореф. дис. ... канд. ист. наук. Курск, 2005 .
16. Гронский А. Д. Политическая полиция Российской империи и ее деятельность на территории Беларуси во второй четверти XIX – начале XX в.: дис. ... канд. ист. наук. Минск, 2003.

17. Гусятников П. С. Революционное студенческое движение в России. 1899–1907. М.: Мысль, 1971.
18. Дерюжинский В. Ф. Полицейское право: пособие для студентов. СПб.: Сенатск. тип., 1911.
19. Ерин Д. А. Организационные и кадровые реформы Российской полиции во второй половине XIX начале XX в.: автореф. дис. ... канд. юрид. наук. М., 2000.
20. Ерошкин Н. П. История государственных учреждений дореволюционной России: учеб. пос. М.: Высш. школа, 1968.
21. Железняк М. Н. К вопросу о борьбе Департамента полиции Российской империи с революционным движением на территории Беларуси 1900–1907 гг. // Романовские чтения – 4. Могилев, 2008. С. 35–36.
22. Жилинский В. Б. Организация и жизнь охранного отделения во времена царской власти: с иллюстрациями. М.: [б. и.], 1918.
23. Жмуровский А. С. Краткий курс истории органов внутренних дел Беларуси: справочник. Минск: Академия МВД, 2014.
24. Закиматова А. Ю. Правовое регулирование службы в органах полиции Российской империи: автореф. дис. ... канд. юрид. наук. Спб., 2006.
25. Капіца П. А. «Часовыя правілы аб уладкаванні паліцыі ў гарадах і паветах» 1862 г.: гісторыка-прававы аналіз // 95 лет милиции Беларуси: материалы респуб. науч.-практич. конференции. Минск, 2012. С. 127–130.
26. Карнович Е. П. Очерки наших порядков административных, судебных и общественных. СПб.: тип. Скарятина, 1873.
27. Киселев А. А. Городские полицейские управления Минской губернии во второй половине XIX в. // Вестник Полесского государственного университета. 2018. № 2. С. 22–30.
28. Киселев А. А. Изменения в структуре Брестского городского полицейского управления в начале XX века // Научные труды Республиканского института высшей школы. 2018. Вып. 18, ч. 1. С. 194–200.
29. Киселев А. А. Общая полиция Минской губернии в начале XX в. // Вестник Полесского государственного университета. 2016. № 2. С. 3–9.
30. Киселев А. А. Общая полиция провинциальных губерний Российской империи в современной российской историографии // Актуальные проблемы российской провинции: вызовы современности. Материалы международной научной конференции. Брянск: ООО «Аверс», 2017. С. 40–51.
31. Киселев А. А. Полицейская стража: несостоявшийся проект // Беларуская думка. 2013. № 2. С. 68–74.
32. Косенко А. А. Организация деятельности городской полиции в белорусских губерниях // Вестник Полоцкого Госуниверситета. Сер. А. 2020. № 1. С. 94–97.
33. Кузьмин А. Социокультурный облик чиновничества (1862–1917). Могилев: МГУП, 2017.

34. Лашкевіч А. А. Чыгуначная жандармерыя ў другой палове XIX — пачатку XX ст. (па дакументах НГАБ) // Архіварыус. 2011. Вып. 9. С. 57–68.
35. Лопухин А. А. Из итогов служебного опыта.
36. Миронов Б. Н. Социальная история России периода империи (XVIII – начало XX в.): В 2 т. СПб.: «Дмитрий Буланин», 2000.
37. Мулукаев Р. С. Политическая полиция дореволюционной России, ее реакционный, антинародный характер. М.: Ред.-изд. отд., 1976.
38. Мурашко А. И. Жандармская полиция на железных дорогах Беларуси: организация и деятельность (1861–1917 гг.). Минск: Академия МВД, 2015.
39. Нахимов А. П., Кирнос А. В., Колесников В. А. Отечественная историография профессиональной подготовки нижнихъ чинов уездной полиции в Российской империи как элемент общей историографии Российской полицеистики // Вестник Воронежского института МВД России. 2019. № 1. С. 9–24.
40. Памятники Российского права. В 35 т. Т. 14. Реформы полиции второй половины 19 века / под общ. ред. Р. Л. Хачатурова. М.: Юрлитинформ, 2015.
41. Перегудова З. И. Департамент полиции в борьбе с революционным движением: автореф. дис. ... канд. ист. наук. М., 1988.
42. Политика, история и администрация: Критич. и полит. статьи А. Градовского. СПб.: М. О. Вольф, 1871.
43. Полиция России. Документы и материалы. Саратов: Сар. Юр. ин-т, 2002.
44. Реент Ю. А. История правоохранительных органов: полицейские и тюремные структуры России. Рязань: Акад. права и управ. Минюста России, 2002.
45. Седунов А. В. Псковская городская полиция в XVIII начале XX вв.: автореф. дис. ... канд. ист. наук. СПб, 2004.
46. Сидоренко Б. И. Полиция губернского Могилева в начале XX века: обязанность, численность, довольствие // Научные труды Могилевского филиала БИП. 2007. Вып. 4. С. 97–101.
47. Смирнов Д. А. Российское государство и полицейская реформа. М.: Альфа-М, 2013.
48. Токарев С. Н. Источники по исследованию деятельности полиции Российской империи начала XX в.: по материалам федеральных архивов и архивов Центрального Черноземья // Вестник архивиста. 2012. № 1. С. 18–37.
49. Тот Ю. В. Реформа уездной полиции в правительственной политике России в XIX веке: автореф. дис. …док. ист. наук. СПб., 2003.
50. Чайкин С. Н. Развитие пенитенциарной системы на территории Беларуси в 1831–1914 гг.: автореф. дис. ... канд. ист. наук. Могилев, 2021.
51. Шелкопляс В. Полицейская реформа в России в 60-х годах XIX века: [учеб. пос.]. Минск: Научно-исслед. и редак.-изд. отдел Минской высшей школы МВД СССР, 1981.
52. Яковчук В. И. Пожарная служба Беларуси: история развития. Минск: БГПУ, 2005.

53. Ярмыш А. Н. Политическая полиция Российской империи (1880–1904 гг.): автореф. дис… канд. юрид. наук. Харьков, 1978.